# ОБЗОРЫ И РЕЦЕНЗИИ

## ДА ПЫТАННЯ НАВУКОВАЙ ВЕРАГОДНАСЦІ ГІСТАРЫЧНЫХ ФАКТАЎ

Великая Отечественная война 1941–1945 годов: в 12 т. / Ю. В. Рубцов (рук. авт. кол.) [и др.]. – М.: Кучково поле, 2012. – Т. 2: Происхождение и начало войны. – 1008 с.

Адной з актуальных праблем вывучэння новых дакументальных крыніц, у тым ліку замежных, з'яўляецца выяўленне ступені навуковай верыфікацыі гістарычных фактаў. Разгледзім гэта на прыкладзе таго, як баявыя дзеянні Чырвонай арміі і германскага вермахта, якія вызначалі адметнасць пачатковага перыяду вайны на беларускай зямлі, адлюстраваны ў новай 12-томнай фундаментальнай працы, падрыхтаванай вядучымі расійскімі даследчыкамі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гадоў [1; 2]. Узнікае пытанне, наколькі іх сутнасць вынікае з новых дакументальных крыніц, выяўленых айчыннымі гісторыкамі пасля адкрыцця архіваў, і наколькі гістарычныя факты набліжаюць чытача да асэнсавання рэальных наступстваў абарончых баёў Чырвонай арміі ў Беларусі ў чэрвені – жніўні 1941 г. Адказаць на гэтыя і іншыя пытанні аўтара гэтых радкоў прымушае ў першую чаргу даследчыцкі інтарэс.

Заўважым, у прадмове да першага тома рэдакцыйная калегія засяроджвае ўвагу чытача якраз на тым, што новую працу расійскіх гісторыкаў «читатели примут только в том случае, … если каждая страница, каждая ее строка будут правдивыми..., необходимо знание правды факта» [1, с. 9]. Аўтар гэтых радкоў цалкам згодны з гэтай думкай. Кожны чытач разумее, што толькі ў апошні час з'явілася ўнікальная магчымасць шырокага выкарыстання новых дакументальных крыніц, якія раней былі маладаступнымі як па прычыне закрытасці айчынных, так і недаступнасці замежных архіваў, а значыць і пошуку шляхоў для праўдзівага адлюстравання на новай аснове падзей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг.

Вызначаныя вышэй падзеі змешчаны ў падраздзеле «Первые оборонительные сражения» заключнага раздзела «Вступление советского народа в борьбу с агрессором» 2-га тома [2, с. 649–829], у якім аўтары падаюць абарончыя баі Заходняга фронту пад адметнай назвай «Катастрофа в Белоруссии». Разгледзім некаторыя факты, што мелі месца ў ходзе абарончых баёў Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. Так, на с. 736 чытаем: «На 22 июня 1941 г. Брестскую крепость защищали порядка 3,5 тыс. человек 6-й и 42-й стрелковых дивизий 28-го стрелкового корпуса РККА» [2, с. 736]. Лічбы, якія традыцыйна фігуравалі ў савецкай гістарыяграфіі аб абароне Брэсцкай крэпасці [3, с. 17; 4, с. 110–111; 5, с. 95–97;], сустракаюцца і ў сучасных беларускіх навуковых працах [6, с. 62].

Аднак сённяшнім днём іх не прымае на павер расійскі даследчык Р. В. Аліеў – аўтар дакументальнай працы «Штурм Брестской крепости» [7]. Яе важнай адметнасцю можна назваць тое, што гісторык адыходзіць

ад класічнай лічбы, якая не адпавядае гістарычнай рэчаіснасці па прычыне таго, што на момант заканчэння нямецкага штурму крэпасці ў нямецкім палоне апынулася звыш 7 тыс. абаронцаў крэпасці і чырвонаармейцаў. Да такой высновы расійскі даследчык прыходзіць пасля вывучэння нямецкіх крыніц, сярод якіх – данясенне камандзіра 45-й пяхотнай дывізіі аб узяцці Брэст-Літоўска ад 8.07.41 г. [7, с. 707]. Асобна адзначым, што згаданае вышэй выданне расійскага гісторыка пабачыла свет у вядомым маскоўскім выдавецтве «Эксмо», аднак на яго ў 2-м томе новага расійскага выдання не спасылаюцца. Узнікае пытанне, па якіх прычынах у грунтоўным выданні не згадваецца ці навукова не аспрэчваецца думка Р. В. Аліева ў дачыненні да агульнай колькасці абаронцаў Брэсцкай крэпасці, лічба якіх толькі на Цэнтральным умацаванні складала каля 9 тыс. чалавек на пачатак нямецкага штурму 22 чэрвеня 1941 г. [7, с. 238]. Тлумачэння гэтаму факту чытач не знойдзе на старонках новага выдання, чаго не змог зрабіць і аўтар гэтых радкоў. Пры гэтым рэдакцыйная калегія новага расійскага выдання пераконвае чытачоў у тым, што пры напісанні працы аўтары «опирались не на идеологические постулаты, а на предыдущие научные исследования с учетом новых методологических подходов и с широким использованием большого массива архивных документов» [1, с. 9]. Таму ў чытача застаецца пытанне, чаму ж у пералік «папярэдніх навуковых даследаванняў» не трапіла 800-старонкавая праца расійскага правінцыйнага гісторыка, напісаная на аснове выкарыстання значнага масіву як савецкіх, так і нямецкіх дакументаў.

На с. 736 чытаем наступнае сцвярджэнне: «К началу июля противнику удалось захватить укрепления на Центральном острове после особенно масштабной бомбардировки и артиллерийского обстрела». Адразу ж узнікае пытанне, чым гэта сцвярджэнне адрозніваецца ад наступнага: «29–30 июня фашисты предприняли «генеральный штурм» Цитадели, в результате которого им удалось занять большую часть укреплений и нанести ее гарнизону тяжелые потери», апублікаванага ў пачатку 1960-х гадоў у 6-томнай «Истории Великой Отечественной войны Советского Союза 1941–1945 гг.» (М., 1961. – Т. 2. – С. 19). У дасведчаных чытачоў, асабліва студэнцкай моладзі, якая добра ведае змест фільма расійскага рэжысёра А. Кота «Бресткая крепость” (2010), узнікаюць і іншыя лагічныя пытанні, у тым ліку аб абароне Цытадэлі. Да таго ж неабходна ўлічваць і той факт, што беларускаму чытачу, дзякуючы новым выданням, таксама вядомы дакладныя звесткі з гісторыі нямецкага штурму крэпасці [8; 9; 10; 11; 12], у якім да 29 чэрвеня самалёты люфтвафэ не ўдзельнічалі [8, с. 152]. Са згаданага вынікае, што Цэнтральны востраў, які з часоў стварэння крэпасці насіў назву «Цэнтральнага ўмацавання», ці «Цытадэлі», паколькі геаграфічна знаходзіўся ў самым «сэрцы крэпасці Брэст-Літоўска» [8, с. 174], пацярпеў асабліва моцную бамбардзіроўку. Нагадаем, што з захаду, поўначы і поўдня Цытадэль прыкрывалі іншыя ўмацаванні – адпаведна Цярэспальскае, Кобрынскае і Валынскае. З айчыннай гістарыяграфіі таксама вядома, што апошнім днём арганізаванай абароны умацаванняў на Цэнтральным востраве лічыцца

26 чэрвеня [7, с. 657]. Пра гэта пішуць не толькі беларускія даследчыкі. Гэта вынікае з фільма «Брэсцкая крэпасць», які быў зняты ў 65-я ўгодкі Перамогі. Пацвярджэнне гэтаму факту знаходзім на старонках нямецкіх кніг, у якіх згадваецца, што самыя цяжкія баі з боку штурмуючых вяліся на працягу трох першых дзён, потым на працягу двух дзён ішлі баі ў асобных ачагах супраціўлення на Цэнтральным востраве ці Цытадэлі. А пасля 26 чэрвеня баі працягваліся толькі за Ўсходні форт, абаронцы якога пасля двух моцных авіяўдараў здаліся ў палон вечарам 29 чэрвеня. Як адзначае К. Ганцар, пасля 26 чэрвеня больш не гінулі ваеннаслужачыя 45-й пяхотнай дывізіі, якая на працягу пяці дзён штурмавала цэнтральныя ўмацаванні крэпасці [11, с. 144]. Вядома, што апошнім непрыступным рубяжом, на які абрынулася не толькі артылерыя, але і нямецкая авіяцыя, з'яўлялася Кобрынскае ўмацаванне, дзе трымаўся Ўсходні форт на чале з будучым Героем Савецкага Саюза – камандзірам 44-га стралковага палка маёрам П. М. Гаўрылавым. Узнікае заканамернае пытанне, а чаму гэтага не ведаюць тыя, хто больш чым праз сем дзесяцігоддзяў піша пра гісторыю легендарнай абароны Брэсцкай крэпасці ў чэрвені 1941 г.? Асабліва пасля таго, як легендарны камандзір і мужны абаронца Ўсходняга форта напісаў успаміны «Крепость сражается», якія вытрымалі два выданні, дзе дэталёва паказаў штодзённыя падзеі сваёй самаадданай барацьбы, упартага выжывання і валявой перамогі.

Не столькі не пішуць, колькі не ведаюць пра што пішуць, блытаюцца ў геаграфіі размяшчэння ўмацаванняў крэпасці, храналогіі рэальных падзей, не паказваюць сапраўдных часовых рамак актыўнай абароны крэпасці, фактычнай колькасці абаронцаў з савецкага боку, а таксама працягваюць замоўчваць той факт, што з першага дня вайны пачалася адна з самых трагічных старонак рэальнай ваеннай гісторыі – нямецкага палону савецкіх воінаў, у які да канца чэрвеня з тэрыторыі крэпасці і горада патрапілі 7 223 чырвонаармейцы. Лёс палонных салдат, сяржантаў і афіцэраў Чырвонай арміі, пасля шматлікіх заклікаў і зваротаў навуковай грамадскасці, у тым ліку аўтара гэтых радкоў [13, с. 29], быў урэшце рэшт ушанаваны ў экспазіцыі, адкрытай у паўночна-ўсходняй казарме Цытадэлі Брэсцкай крэпасці ў 2014 г. і адзначанай спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2014 года [14, с. 2].

Выклікае пытанні і такое сцвярджэнне на с. 746: «По некоторым подсчетам, контрудар стоил 5-му и 7-му механизированным корпусам 2/3 парка боевых машин (в составе их находились 1639 танков; 924 в 5-м и 715 в 7-м. – *С. Н.*), среди которых немало неисправных». У гэтай сувязі чытачу цяжка зразумець, чаму да гэтага часу не зроблены неабходныя падлікі, чаму ў навуковы дыскурс уводзяцца тыя баявыя адзінкі тэхнікі, якія апрыёры з'яўляліся няспраўнымі, г.зн. не ўдзельнічалі ў рэальных баявых дзеяннях. Якраз такі фактар істотна паўплываў на вынікі тых баёў, якія 5-ы і 7-ы МК вялі на Віцебшчыне ў пачатку ліпеня 1941 г. Такім чынам, чытач застаецца без яснага разумення карціны сустрэчных танкавых баёў

на аршанска-віцебскім напрамку: з аднаго боку – наступаючых танкавых і матарызаваных злучэнняў 3-й танкавай групы, а з другога – контрнаступаючых сіл двух механізаваных карпусоў Чырвонай арміі.

У тэксце новага выдання ўважліваму чытачу не ўдасца знайсці адказы і на некаторыя іншыя пытанні, у тым ліку аб храналагічных рамках танкавых баёў пад Сянно і Лепелем, агульнай колькасці баявых машын, якія з двух бакоў удзельнічалі ў баях на Віцебшчыне; аб стратах, панесеных з абодвух бакоў у ходзе танкавых баёў з 5-м і 7-м МК РСЧА і прычынах фактычнага разгрому двух механізаваных карпусоў Чырвонай арміі падчас контрудараў на лепельскім напрамку; аб аператыўна-тактычным значэнні Лепельскай аперацыі ў кантэксце замацавання ў сучаснай айчыннай літаратуры тэзіса аб «самай буйной танкавай бітве ў сусветнай гісторыі» пад Сянно. Для беларускага чытача апошняе пытанне застаецца асабліва актуальным, калі мець на ўвазе новыя публікацыі, якія на падставе выкарыстання метаду кампаратыўнага аналізу айчынных і замежных дакументальных крыніц не толькі аспрэчваюць згаданы тэзіс, але і раскрываюць ненавуковы характар яго ўжывання [15, с. 14–24].

Распавядаючы пра баі пад Магілёвам, аўтары новага расійскага выдання зрабілі некалькі навуковых вывадаў, крытычны аналіз якіх неабходны па розных прычынах, і ў першую чаргу з-за іх неадпаведнасці вядомым на цяперашні час дакументальным фактам. Напрыклад, на с. 746 2-га тома сцвярджаецца: «К 9 июля танки Гудериана подошли к Могилеву». Адразу ўзнікае пытанне, на падставе якіх дакументаў зроблена такая выснова, калі мець на ўвазе добра вядомыя гістарычныя звесткі пра тое, што бой на Буйніцкім поле пад Магілёвам адбыўся 12 ліпеня 1941 г., пра што яшчэ ў ліпені 1941 г. пісалася ў савецкім друку.

Але ж наколькі прыведзены вышэй пасаж тлумачыць храналогію падзей абароны Магілёва, адлюстраваны на с. 775 выдання, дзе аўтары пішуць: «Бои на этом [Могилевском. – *С.Н.*] направлении начались еще 3 июля 1941 г. Вскоре в сражение вступили части 172-й стрелковой дивизии генерал-майора М. Т. Романова, на которую была возложена непосредственная оборона Могилева... Особенно тяжелой была обстановка, где держался 338-й [так у тэксце. – *С.Н.*] стрелковый полк 172-й дивизии и помогали части народного ополчения (в отечественной историографии известен как бой на Буйничском поле)... На поле под Буйничами осталось не менее 24 подбитых вражеских бронемашин» [2, с. 775]. Дэталёвы аналіз зместу гэтага тэзісу патрабуе звароту да пэўных дакументальных крыніц. Аднак на падставе якіх фактычных даных можна сцвярджаць аб пачатку баёў на магілёўскім напрамку, прапануючы за момант адліку 3 ліпеня, калі баявы загад № 1 на абарону горада камандзірам 172-й стралковай дывізіі генерал-маёрам М. Ц. Раманавым быў аддадзены не 3, а толькі 7 ліпеня, прычым у 20.30 [16, с. 15–16]. Што гэта азначала на самой справе? З гэтага моманту баявы загад неабходна было тэрмінова перадаць камандзірам палкоў, якія толькі тады маглі пачаць выкананне тых баявых задач, што былі вызначаны камандзірам дывізіі.

Дык з якога гістарычнага моманту неабходна пачынаць адлік гісторыі абароны горада? З моманту, які ўвайшоў у айчынную гістарыяграфію на падставе даты, прапанавай ва ўспамінах былога намесніка камандуючага Заходнім фронтам генерал-лейтэнанта А. І. Яроменкі? Ці даты паводле баявога загада № 1 ад 07.07.41 г., аддадзенага генерал-маёрам М. Ц. Раманавым? Ці паводле іншых загадаў? Якіх? Аднак на гэтыя пытанні мы не знаходзім адказу ў новым выданні.

Таксама не зразумела, чаму прыводзіцца згадка пра 338-ы стралковы полк 172-й стралковай дывізіі. У дачыненні да назвы палка неабходна адразу ж заўважыць, што палкоўнік С. Ф. Куцепаў адказваў за арганізацыю абараны магілёўскага плацдарма на лініі Зацішша – Буйнічы і камандаваў паводле загада № 1 камандзіра 172-й стралковай дывізіі не 338-м, а 388-м стралковым палком. Нагадаем, што згодна загада № 1 ад 7.07.41 г. абарону горада павінны былі забяспечыць тры палкі 172-й стралковай дывізіі (388-ы, 747-ы і 514-ы) і 394-ы полк 110-й сд [16, с. 15–16], якія абараняў рубеж у напрамку Шклова, на паўднёвы захад і захад ад Княжыцаў. Але менавіта 388-ы стралковы полк пры падтрымцы артылерыстаў 340-га лёгкага артылерыйскага палка і палкавога сапёрнага падраздзялення спынілі танкавы ўдар 3-й танкавай дывізіі вермахта на Магілёў з паўднёвага захаду.

У гэтым сэнсе ўзнікае пытанне ў дачыненні да наступнай высновы, згаданай у новай калектыўнай працы расійскіх гісторыкаў. На с. 777 сустракаем: «Будучи раненым, генерал Романов был укрыт местными жителями, впоследствии организовал партизанский отряд, но был выдан изменником и казнен фашистами». Што ў якасці доказаў стаіць за гэтым тэзісам, калі мець на ўвазе дакументальна пацверджаны факт, што з восені 1941 г. генерал Раманаў апынуўся сярод вязняў аднаго з спецыяльных лагераў «Афлаг XIII С», побач з баварскім горадам Хамельбург, у якім утрымліваліся савецкія палонныя афіцэры, у тым ліку маёр Гаўрылаў, капітан Зубачоў і іншыя. Паводле карткі асабістага ўліку ваеннапалонных лёс генерала Раманава трагічна абарваўся 3 снежня 1941 г., калі легендарны абаронца памёр ад ранення, атрыманага ў час выхаду з акружэння пад Магілёвам.

Узнікае пытанне і да наступнага выказвання на с. 746: «Больших жертв стоило врагу взятие города Могилев, где стойко держались немногочисленные советские войска». Кажучы пра першую частку цытаты, бачым, што аўтары не прывялі дакладных даных, маючы на ўвазе думку, якую выказаў у пасляваенных успамінах Маршал Савецкага Саюза Г. К. Жукаў у дачыненні да колькасці страт з боку нямецкай жывой сілы ў ходзе 23-дзённай абароны горада Магілёва. У мемуарах прыводзіцца лічба: звыш 30 тыс. нямецкіх салдат і афіцэраў. Як зразумець тады выраз «немногочисленные советские войска», штат якіх, паводле плана камплектавання ад 1.04.1941 г., павінен быў складаць 14 тыс. чалавек? У гэтым выпадку атрымліваецца, што адна толькі 172-я стралковая дывізія знішчыла каля Магілёва звыш 30 тыс. нямецкіх салдат і афіцэраў. Аднак наколькі гэта лічба адпавядае нямецкім дакументам, непасрэдна тым фактычным даным, што былі замацаваны ў дзённіках

баявых дзеянняў кожнай з чатырох пяхотных дывізій, якія на працягу тыдня вялі штурм умацаванага плацдарма пад Магілёвам. Паводле нямецкіх дакументальных даных агульная лічба страт складала 3 765 афіцэраў, унтэр-афіцэраў і салдат, у тым ліку: былі забіты – 727, паранены – 2 867 і зніклі – 171 чалавек [17, с. 182].

У гэтай сувязі не менш важным нам бачыцца актуальнасць пытання аб раскрыцці сцвярджэння аб нешматлікіх савецкіх войсках пад Магілёвам. З кантэксту кнігі вынікае, што да ліку абаронцаў магілёўскага плацдарма аўтары адносяць толькі адну 172-ю стралковую дывізію. Наколькі гэта так, можна меркаваць, кіруючыся дакументальнымі звесткамі, выяўленымі аўтарам гэтых радкоў у нямецкіх дакументах. У іх размова ідзе пра колькасць савецкіх ваеннапалонных, якія ў ходзе абароны горада на Дняпры апынуліся ў нямецкім палоне. З нямецкіх дакументаў вынікае, што агульная лічба ваеннапалонных складала 35 031, з якіх 31 – афіцэр РСЧА. З гэтай агульнай лічбы бачна, што гэта колькасць не менш за тры савецкія дывізіі, якія абаранялі горад. Але ці ёсць пра гэта ў новым выданні? Больш за тое, ці ідзе ў ім гаворка пра савецкіх ваеннапалонных, факты пра якіх замоўчваюцца і па сённяшні дзень. Асабліва з улікам таго, што менавіта на беларускай зямлі загінуў фактычна кожны трэці баец, узяты ў палон групай армій «Цэнтр», і кожны пяты, хто апынуўся ў нямецкім палоне ў гады вайны.

З новых дакументальных крыніц вынікае, што магілёўскі плацдарм на працягу некалькіх дзён абараняла не адна штатная 172-я стралковая дывізія, а аб'яднаныя сілы некалькіх, у тым ліку: 110-й, 84-й, 100-й, 148-й, 161-й, 24-й і 50-й стралковых дывізій. З нямецкіх дакументаў вынікае, як складана вызначыць тое, ці былі выяўленыя вайсковыя часці толькі далучаныя да асноўных сіл у якасці ўзмацнення пры правядзенні баявых дзеянняў пад Магілёвам, ці яны ўліліся ў якасці папаўнення ў склад чатырох адмабілізаваных стралковых дывізій (110-й, 172-й, 148-й і 161-й). Да ўсяго таго трэба мець на ўвазе, што ў Магілёве і яго ваколіцах трапілі ў палон чырвонаармейцы іншых стралковых падраздзяленняў, а таксама часці 210-й матарызаванай дывізіі і часці ці рэшткі часцей 26-й і 38-й ранейшых танкавых дывізій, якія сталі матарызаванымі, і інш.

З дакументаў 7-га палявога армейскага корпуса бачна, што абарону магілёўскага плацдарма вялі дзве штатныя дывізіі (110-я і 172-я), якія раней не былі задзейнічаны ў баях, тры выматаныя, але баяздольныя дывізіі (148-я, 161-я стралковыя і 210-я матарызаваная), а таксама рэшткі 24-й, 50-й, 100-й і іншых стралковых дывізій. Вось чаму цалкам прымальнай з'яўляецца лічба агульнай колькасці савецкіх вайскоўцаў, якія трапілі ў нямецкі палон у ходзе Магілёўскай бітвы [17, с. 181].

Заключны тэзіс, на які хацелася б звярнуць увагу чытача, знойдзем на с. 785, дзе запісана: «Сильный контрудар по противнику в середине июля нанесла 21-я армия, освободив Жлобин и Рогачев. Этот успех стал одной из первых удачных локальных операций РККА, сковавшей на некоторое время главные силы 2-й немецкой армии в междуречье Днепр и Березина».

Звернемся да дзённіка, з якога вынікае, што баявыя дзеянні 63-га стралковага корпуса пад камандаваннем генерала Пятроўскага былі не толькі адметнымі ў тактычным плане, скаваўшы на некаторы час галоўныя сілы 2-й нямецкай арміі, але і вызначальнымі ў прыняцці важных стратэгічных рашэнняў на ўзроўні Вярхоўнага Галоўнакамандавання германскага вермахта ў канцы ліпеня 1941 г. Па нашым перакананні, 30 ліпеня А. Гітлер падпісаў дырэктыву № 34, паводле якой група армій «Цэнтр» спыняла сваё наступленне на Маскву і пераходзіла да абароны на гэтым участку Усходняга фронту [17, с. 174–182]. Гэта азначала, што план маланкавай вайны пачаў даваць пэўныя збоі. І адной з важных прычын гэтага стала пагрозлівае становішча, створанае сіламі Чырвонай арміі супраць правага фланга групы армій «Цэнтр» на Гомельшчыне летам 1941 г. Тут важна адзначыць, што новае расійскае выданне ўтрымлівае даволі пераканаўчыя факты, якія сведчаць аб стратэгічнай важнасці контрудару 21-й арміі РСЧА.

Такім чынам, гісторыя баявых дзеянняў Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г., адлюстраваная ў адной з кніг шматтомнай працы, выклікае не толькі шмат пытанняў, але і ставіць на парадак дня праблему навуковай верыфікацыі новых гістарыяграфічных фактаў, замацаваных у якасці асновы для грунтоўнага выдання пры паказе двухмесячных абарончых баёў і правядзення контрудараў сіламі войск Заходняга і Цэнтральнага франтоў супраць войскаў нямецкай групы армій «Цэнтр». Фактаў, частка з якіх не вытрымлівае навуковай праверкі на аснове супастаўлення з новым корпусам дакументальных крыніц. З улікам гэтага неабходна правядзенне крытычнага аналізу іншых аспектаў гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на аснове кампаратыўнага аналізу дакументальных крыніц. Перад беларускімі гісторыкамі паўстаюць наступная навуковыя задачы: папершае, баявыя дзеянні Чырвонай арміі і германскага вермахта на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. патрабуюць працягу скрупулёзнай работы з дакументальнымі крыніцамі; па-другое, прафесійная культура даследчыкаў выступае на пярэдні край у якасці вызначальнага фактара далейшага развіцця гістарычнай навукі; па-трэцяе, навуковая апрацоўка ваеннага мінулага стаіць на службе не столькі патрабаванняў сучаснага моманту, колькі нашай будучыні.

## ЛІТАРАТУРА

1. Великая Отечественная война 1941–1945 годов: в 12 т. / В. А. Золотарев (рук. авт. кол.) [и др.]. – М. : Воениздат, 2011. – Т. 1: Основные события войны. – 848 с.
2. Великая Отечественная война 1941–1945 годов: В 12 т. / Ю. В. Рубцов (рук. авт. кол.) [и др.]. – М. : Кучково поле, 2012. – Т. 2: Происхождение и начало войны. – 1008 с.
3. Героическая оборона. – 2-е изд., доп. – Минск : Изд-во Госиздат БССР, 1963. – 598 с.

4. Бресткая крепость // Великая Отечественная война 1941–1945: энцикл. / редкол.: Ю. Я. Барабаш, П. А. Жилин (зам. гл. ред.), В. И. Канатов (отв. секретарь) [и др.]. – М. : Сов. энциклопедия, 1985. – С. 110–111.
5. Брэсцкай крэпасці абарона 1941 // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: энцыкл. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1990. – С. 95–97.
6. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941 – 1945 / А. А. Коваленя (рук. авт. кол.), А. М. Литвин, В. И. Кузьменко [и др.]. – Минск : БЕЛТА, 2005. – 544 с.
7. *Алиев, Р. В.* Штурм Брестской крепости / Р. В. Алиев. – М.: Яуза; Эксмо, 2008. – 800 с.
8. Бресткая крепость. Война и мир / авт. концепции и текста А. Суворов. – Брест: Полиграфика, 2010. – 256 с.
9. Данясенне аб ходзе баявых дзеянняў пры ўзяцці Брэст-Літоўска // Беларуская думка. – 2010. – № 5. – С. 93–97.
10. *Новікаў, С. Я.* Абарона Брэсцкай крэпасці летам 1941 года ў ацэнцы гістарыяграфіі і ў святле дакументаў / С. Я. Новікаў // Беларуская думка. – 2010. – № 5. – С. 88–92.
11. *Алиев, Р. В.* Брест. Июнь. Крепость: в 2 кн. / Р. Алиев, И. Рыжов. – Брест : Полиграфика, 2012. – Кн. 1. – 272 с.
12. *Ганцэр, К.* Нямецкія і савецкія страты як паказчык працягласці і інтэнсіўнасці баёў за Брэсцкую крэпасць / К. Ганцэр. – ARCHE. – 2014. – № 5. – С. 135–153.
13. *Новікаў, С. Я.* Абарона Брэсцкай крэпасці: гістарыяграфічныя міфы і гістарычная рэальнасць / С. Я. Новікаў // Историческое наследие 1941 года в исследованиях и экспозициях музеев: материалы Междунар. науч. конф., посвященной 70-летию обороны Брестской крепости, Брест, 9–11 июня 2011 г.). – Брест : Альтернатива, 2013. – С. 22–29.
14. Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2014 года // СБ – Беларусь сегодня. – 2015. – 3 янв.
15. *Новікаў, С. Я.* Лепельская аперацыя летам 1941 года: спроба навуковай інтэрпрэтацыі / С. Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 11. – С. 14–24.
16. *Новікаў, С. Я.* Абарона Магілёва 1941 года: новыя звесткі / С. Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 7. – С. 15–16.
17. *Новікаў, С. Я.* Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў / С. Я. Новікаў. – Мінск : МДЛУ, 2014. – С. 204.

*С. Я. Новікаў*